# Утрымліваючы лідарства

18.03.2017 - 12:15 Планёрка ў рэгіёне

**На трэцім этапе Рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах Маскоўскі раён Мінска прадстаўлялі 203 навучэнцы. Заваяваўшы 123 дыпломы і 21 пахвальны водзыў, каманда паказала найлепшы вынік сярод раёнаў горада і зноў заняла 1-е месца. Найбольшую колькасць дыпломаў атрымалі навучэнцы гімназіі № 41 імя В.Х.Сярэбранага — 41. Гэтая сімвалічная лічба прынесла ім і званне лепшай гімназіі горада. Дастойна выступілі навучэнцы ліцэя № 1, якія прынеслі ў скарбонку раёна 18 дыпломаў. Былі заваяваны кубкі па матэматыцы, астраноміі, хіміі і біялогіі. Зараз ажыццяўляецца інтэнсіўная падрыхтоўка навучэнцаў, якія ўвайшлі ў склад зборных каманд горада, да заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды. Аб гэтым расказала госць нашай "Суботняй планёркі" — начальнік упраўлення адукацыі адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы Ала Дзмітрыеўна КУНІЦКАЯ.**

**— Ала Дзмітрыеўна, што прывяло раён да такога поспеху? Якая сістэма работы склалася з адоранымі дзецьмі?**

— Работа з высокаматываванымі і адоранымі навучэнцамі ў раёне вядзецца з ранняга ўзросту. Штогод праводзіцца шэраг конкурсаў, якія сталі традыцыйнымі, а некаторыя з іх набылі статус гарадскіх і міжнародных. Так, гімназія № 174 Мінска штогод арганізоўвае Міжнародную маладзёжную навукова-практычную канферэнцыю "Вялікая Айчынная вайна 1941—1945 гадоў у гістарычнай памяці народа". Навукова-практычная канферэнцыя "Асоба ў гісторыі: Г.К.Жукаў і яго роля ў пераломных бітвах Вялікай Айчыннай вайны", якую праводзіць сярэдняя

Мы выкарыстоўваем файлы "cookies" і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп'ютары.

Ok Падрабязней.

класаў праверыць свае сілы і паспаборнічаць за званне лепшага знаўцы матэматыкі дазваляе ўдзел у раённай алімпіядзе “Турнір юных матэматыкаў”, якая з году ў год праводзіцца на базе гімназіі № 146 Мінска.



Навучэнцы раёна прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх інтэлектуальных конкурсах, алімпіядах, турнірах, што праводзяцца ў раёне і горадзе. Аднак галоўным спаборніцтвам разумнікаў і разумніц з’яўляецца Рэспубліканская прадметная алімпіяда. Да ўдзелу ў ёй адказна рыхтуюцца ва ўсіх установах адукацыі раёна. Высокія вынікі дасягаюцца і дзякуючы супрацоўніцтву гімназій і ліцэя з выкладчыкамі УВА. Падчас канікул на базе ліцэя і гімназій у аздараўленчых летніках арганізоўваецца работа профільных атрадаў, якая дазваляе навучэнцам пашырыць свае веды і адпачыць. Для таго каб установы маглі аб’ектыўна выбраць найбольш падрыхтаваных навучэнцаў, лепшых з лепшых, творчыя групы перадавых педагогаў раёна ўжо працуюць над складаннем заданняў для першага этапу алімпіяды. Пытанні падрыхтоўкі навучэнцаў абмяркоўваюць педагогі на пасяджэннях метадычных аб’яднанняў. Лепшы вопыт работы ўстаноў адукацыі раёна з высокаматываванымі навучэнцамі трансліруецца на метадычных мерапрыемствах.

**— А якімі дасягненнямі педагогаў і вучняў раён ганарыцца?**

Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары.

Ok

Падрабязней.

Уладзіслаў Раянтовіч, выпускнік гімназіі № 61 Мінска, — першы выпускнік за ўсю гісторыю правядзення ЦТ у Беларусі, які паказаў максімальны вынік, набраўшы 399 балаў (сярэдні бал атэстата плюс тры стабальныя вынікі ЦТ).

Штогод педагогі раёна ўдзельнічаюць у гарадскім конкурсе “Вопыт і ініцыятыва педагогаў — рэсурс адукацыі сталіцы”. Па выніках мінулага года 9 педагогаў былі ўдастоены прэмій Мінгарвыканкама. На рэалізацыю трох праектаў былі выдзелены гранты.

На працягу многіх гадоў педагогі раёна дэманструюць высокі ўзровень прафесійнага майстэрства, удзельнічаючы ў конкурсе “Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі”. У мінулым навучальным годзе 1-е месца ў намінацыі “Лідар адукацыі” заняла намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце гімназіі № 10 Мінска Ірына Вячаславаўна Братчэня, 2-е месца ў гэтай жа намінацыі — у намесніка дырэктара па вучэбнай рабоце сярэдняй школы № 218 Віктара Аляксандравіча Дарожкі. У намінацыі “Педагог-псіхолаг” 1-га месца ўдастоена педагог-псіхолаг сярэдняй школы № 9 Мінска Вольга Ігараўна Івашына, 3-га — педагог-псіхолаг сярэдняй школы № 215 Святлана Леанідаўна Анцюшэня.

**— Ала Дзмітрыеўна, Маскоўскі раён актыўна забудоўваецца, колькасць маладых сем’яў павялічваецца. Як вырашаецца праблема забяспечанасці месцамі ў дзіцячых дашкольных установах?**

— Прымаюцца меры, якія дазваляюць павялічыць колькасць месцаў ва ўстановах дашкольнай адукацыі, развіваюцца розныя формы дашкольнай адукацыі. З 1 верасня адноўлена функцыянаванне групавых памяшканняў ва УДА №№ 560, 541, 546, 554, 555, адкрыты дашкольныя ўстановы № 128 у мікрараёне Міхалова-2 на 230 месцаў і № 105 на 150 месцаў. Усё гэта дазволіла павялічыць колькасць месцаў у дашкольных установах на 480.

Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары.

Ok

Падрабязней.

раёне тры сямейныя групы (сямейныя дзіцячыя сады), якія з'яўляюцца адной з новых форм арганізацыі дашкольнай адукацыі.

**— Якія праблемы хвалююць сёння педагагічную грамадскасць раёна?**

— Прыярытэтным напрамкам для педагогаў з'яўляецца стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу для навучэнцаў і выхаванцаў. Вялікая ўвага ў раёне ўдзяляецца рабоце з высокаматываванымі і адоранымі навучэнцамі. Эфектыўная арганізацыя шостага школьнага дня таксама ў прыярытэце.

Павышэнне якасці адукацыі немагчыма без добрай забяспечанасці ўстаноў адукацыі сучасным абсталяваннем і без укаранення перадавых адукацыйных тэхналогій, таму вялікае значэнне мы надаём павышэнню матэрыяльна-тэхнічнай аснашчанасці ўстаноў, узроўню адукацыйнага асяроддзя.

У сувязі з актыўнай забудовай Маскоўскага раёна на першы план выходзіць праблема забеспячэння жыхароў дзіцячымі дашкольнымі ўстановамі ў крокавай даступнасці. У планах забудовы: дашкольная ўстанова ў межах вуліц Каралінскай — Некрашэвіча (2019—2020 гады), а таксама дзве школы — на вуліцы Яна Чачота, якую мы будзем чакаць у 2018 годзе, і на вуліцы Чурлёніса — у 2019—2020 гадах.

**Гутарыла Наталля КАЛЯДЗІЧ.**

## Актуальные новости

Мы выкарыстоўваем файлы "cookies" і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп'ютары.

Ok Падрабязней.

24.01.2023 15.01.2023

## НОВОСТИ

«Студэнцтва і прафсаюз разам». Лучшую учащуюся молодежь наградили за активную деятельность

Загадчыца школьнай сталовай Ірына Арцюшова: «Не думала, што мая праца будзе такой насычанай і разнастайнай»

«Лясны дазор» спяшаецца на дапамогу: школьнае лясніцтва дзейнічае ў Пярэкальскай СШ

Профориентация в Копыле: школьники обучались поварскому делу и изучали работу слесаря и сварщика

Прадстаўнікі каледжаў Віцебшчыны паспяхова выступілі на спаборніцтвах у сферы прыгажосці

## АВТОРСКИЕ КОЛОНКИ

**ЕКАТЕРИНА ДУБИНСКАЯ**

МУДРЫЕ ОТ ЗЕМЛИ



**НАТАЛИЯ БУШНАЯ**

КОГДА ЦЕННОСТИ ОБЩИЕ



**ИВАН ЖДАНОВИЧ**

26-Е ПУШКІНСКАЕ МЕСЦА



Мы выкарыстоўваем файлы “cookies” і падобныя тэхналогіі на нашым вэб-сайце, каб палепшыць работу і павысіць эфектыўнасць сайта. Працягваючы работу з сайтам nastgaz.by, Вы пагаджаецеся з размяшчэннем cookie-файлаў на Вашым камп’ютары.

Ok Падрабязней.